3. Жилина, В. А. Мифология и идеология / В. А. Жилина // Актуальные вопросы современной науки. – 2019. – № 8. – С. 117–125

Герасимѐнок В.Д., студент 250 группы
дневной формы обучения
Научный руководитель – Колобова И.Н.,
кандидат исторических наук, доцент

# ЗАХАВАННЕ ПАМЯЦІ АБ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЕ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На тэрыторыі Беларусі засталося шмат памятных мясцін і помнікаў, звязаных з гісторыяй Першай сусветнай вайны (1914 – 1918). У савецкі перыяд гэта вайна была прызнана імперыялістычнай, таму захаваннем памяці аб ѐй фактычна не цікавіліся. Адраджэнне амаль загінулых помнікаў і пабудова новых мемарыялаў, прысвечаных падзеям Першай сусветнай вайны на нашых землях, фактычна пачынаецца толькі ў сучаснай Беларусі.

На беларускай тэрыторыі адбылося некалькі буйных бітваў, якія паўплывалі на ўвесь ход ваенных дзеянняў. Сярод іх можна вылучыць Свянцянскі прарыў немцаў і яго ліквідацыю восенню 1915 г. (тэрыторыя Маладзечанскага, Смаргонскага, Вілейскага раѐнаў); гераічную 810-дзѐнную абарону расійскімі войскамі г. Смаргонь і кровапралітную Нарачанскую аперацыю ў сакавіку 1916 г. (Мядзельскі, Вілейскі і Пастаўскі раѐны). Захоўвае памяць аб вайне і знакамітае Буйніцкае поле пад Магілѐвам [4, с. 45].

На пачатку вайны фартыфікацыя заходняй часткі Расійскай імперыі ўяўляла сабой сістэму абарончых збудаванняў, у якую ўваходзілі Брэст-

Літоўская, Гродзенская і Бабруйская крэпасці. У першай праходзіла чарговая мадэрнізацыя, а другая не была дабудавана. Існуючая крэпасць у Бабруйску да пачатку XX ст. была ўжо састарэлай у фартыфікацыйных адносінах і выкарыстоўвалася для размяшчэння гарнізона.

На сѐнняшні дзень ўздоўж усѐй былой лініі фронту захаваліся і сотні такіх фартыфікацыйных умацаванняў, як рэшткі земляных акопаў і жалезабетонных сховішчаў. Большасць з іх сканцэнтравана ў Баранавіцкім, Ляхавіцкім, Смаргонскім, Мядзельскім, Вілейскім раѐнах. Да нашага часу планамернай працы па вывучэнні, інвентарызацыі і размініраванні гэтых палявых фартыфікацый не праводзілася. Ніводнае з гэтых збудаванняў зараз не выкарыстоўваецца [4, с. 44 – 45].

Да пачатку Першай сусветнай вайны ў наваколлях Гродна было збудавана 13 фортаў і 24 апорных пункта на адлегласці 8 – 15 км ад горада. У жніўні 1915 г. тут прайшлі досыць упартыя ар'ергардныя баі адступаючай расійскай арміі. Фартыфікацыйныя збудаванні Гродзенскай вобласці ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны, на некаторых з іх устаноўлены мемарыяльныя знакі ў выглядзе праваслаўных крыжоў і інфармацыйных таблічак, праводзяцца экскурсіі [7, с. 24 – 25].

Для размяшчэння шматлікіх вайсковых частак будаваліся цэлыя ваенныя гарадкі з баракаў. З захаваных аб'ектаў можна назваць дом Маліна (г. Мінск, вул Валадарскага, 9), дзе ў гады Першай сусветнай вайны размяшчаўся "Стройзап" (будаўніча-тэхнічны аддзел Заходняга фронту). У ваенных гарадку г. Баранавічы да 8 жніўня 1915 г. знаходзілася Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандуючага расійскай арміяй. У далейшым забудова гэтага гарадка выкарыстоўвалася пад жыллѐ, аднак на сѐнняшні дзень там ідзе працэс паступовага зносу старых будынкаў [4, с. 44].

Воінскія пахаванні размяшчаліся ўздоўж лініі фронту, як з расійскага, так і з нямецкага боку, у тым ліку каля палѐў бітваў, у прыфрантавой паласе, пры шпіталях, на гарадскіх (сельскіх) могілках.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адметная асаблівасць ваенных пахаванняў Першай сусветнай вайны – гэта сумеснае пахаванне салдат супрацьлеглых войскаў. Сѐння на тэрыторыі Беларусі выяўлена больш за 200 пахаванняў і больш за 90 могілак з індывідуальнымі надмагіллямі. Адным з самых вядомых з'яўляюцца Брацкія ваенныя могілкі, размешчаныя ў Мінску паміж вуліцай Чарвякова і Старавіленскім трактам [1].

Брацкія вайсковыя могілкі воінаў Першай сусветнай вайны былі заснаваны ў Мінску 29 лістапада 1914 г. на Пярэспе. Уладамі Расійскай імперыі быў разасланы афіцыйны цыркуляр, па якім хаваць воінаў трэба было толькі на спецыяльна адведзеных для гэтага могілках. Ініцыятарам стварэння могілак быў кіраўнік Аляксандраўскага камітэта аб параненых генерал-лейтэнант П.А. Смародскі. Камітэт дамовіўся выкупіць у Кафедральнага сабору ў Мінску больш за 10 га зямлі паміж Віленскім (цяпер Старавіленскі) і Даўгінаўскім (вуліца Чарвякова) трактамі. Неўзабаве тэрыторыю абнеслі драўляным плотам, у цэнтры ўзвялі невялікую капліцу. Першыя пахаванні на Мінскіх брацкіх ваенных могілках былі зроблены 26 жніўня 1915 г.

У савецкі час спачатку была зруйнавана капліца, а ў канцы 1940-х знесены і самі могілкі. На іх месцы размясціўся Старажоўскі рынак, дзе прадавалі жывѐл і птушак. Праіснаваў ѐн да вясны 1996 г., калі пад цяжарам снега не паваліліся падстрэшкі гандлѐвых шэрагаў. Рынак не сталі аднаўляць і аператыўна ліквідавалі, а на ягоным месцы разбілі сквер.

Пасля скасавання рынку тэрыторыя магільніка атрымала статус аб'екта гісторыка-культурнай спадчыны. У 2000-х гг. тэрыторыя Мінскіх брацкіх ваенных магілак пачала дабраўпарадкоўвацца і адбылося будаўніцтва мемарыяла, які быў урачыста адкрыты 14 жніўня 2011 г. Разам з воінскімі ўшанаваннямі ў крыпце капліцы былі пахаваны астанкі трох невядомых салдат расійскай арміі, якія загінулі ў гады Першай сусветнай вайны [6].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сувязі са стагоддзем пачатку Першай сусветнай вайны ў Беларусі сталі праводзіцца мерапрыемствы па вяртанні гістарычнай памяці аб гэтых падзеях. 1 жніўня 2014 г. у г. Смаргонь Гродзенскай вобласці адбылося адкрыццѐ мемарыяльнага комплексу памяці герояў і ахвяр гэтай вайны. Мемарыяльны комплекс размешчаны на Алеі памяці і складаецца з трох скульптурных кампазіцый: "Бежанцы", "Салдаты Першай сусветнай вайны", "Крылаты геній салдацкай славы". Уваход у мемарыяльны комплекс пазначаны Георгіеўскім крыжом. Усталявана зона «памяці і смутку», а з бронзы адліта карта ваенных падзей 1915 – 1917 гг. Побач усталяваны дзве мемарыяльныя скрыні з зямлѐй з месцаў пахавання воінаў расійскай і нямецкай армій. Там жа размешчана невялікая капліца, дзе кожны ахвочы можа пазваніць у звон [5].

Рэстаўрацыйныя работы адбыліся і на мусульманскіх могілках ў Смаргоні, дзе ѐсць пахаванні 1914 – 1915 гг. воінаў Казанскай, Уфімскай і Самарскай дывізій.

У в. Баруны на Ашмяншчыне на нямецкіх могілках у 1916 г. былі пахаваны лѐтчыкі экіпажа самалѐта "Ілья Мурамец": паручнікі Дзмітрый Макшэеў, Мітрафан Рахмін, Фарух-Ага-Мамед Гаібаў і кадэт Алег Карпаў. У момант адбіцця атакі чатырох нямецкіх знішчальнікаў была пашкоджана галоўная стойка крыла ―Ільі Мурамца”, з-за чаго самалѐт увайшоў у штопар і ўпаў на зямлю. Уражаныя мужнасцю экіпажа, немцы на кожнай з чатырох магіл лѐтчыкаў усталявалі праваслаўныя крыжы, а на дошцы быў зроблены надпіс на нямецкай мове: «Тут пахаваны 4 рускія лѐтчыкі, збітыя ў паветраным баі 25.9.1916". Пазней на месцы чатырох магіл быў пастаўлены адзін праваслаўны крыж, які захаваўся да нашых дзѐн, з надпісам: "Тут пахаваны чатыры невядомыя рускія лѐтчыкі». У 2009 г. ў цэнтры вѐскі быў адкрыты помнік лѐтчыкам-героям Першай сусветнай вайны. Ён уяўляе сабой вялізны гранітны валун з барэльефамі лѐтчыкаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

экіпажа "Ільі Мурамца" і іх імѐнамі, якія ў выніку даследванняў сталі вядомыя краязнаўцам [7, с. 24].

Прыкладам таго, калі добраахвотнікі пры падтрымцы дзяржавы змаглі стварыць адначасова месца ўшанавання памяці загінулых і прыцягнуць сваѐй унікальнасцю да яго турыстаў, з’яўляецца музей Першай сусветнай вайны ў в. Заброддзе Вілейскага раѐна. Гэта маленькая вѐсачка з трыма вясковымі домікамі размяшчаецца ў Вілейскім раѐне на р. Нарачанка, дзе больш за сто гадоў таму праходзіла лінія фронту [3]. Знакамітая яна тым, што ў ѐй, акрамя рэтратэхнікі, прадметаў часоў Вялікай Айчыннай вайны і памятных месцаў размешчаны адзіны ў Беларусі музей Першай Сусветнай Вайны. Экспазіцыя музея прадстаўляе калекцыю арыгінальных прадметаў і дакументаў, якія адлюстроўваюць тагачасныя ваенныя будні [2].

Не гледзячы на падтрымку ўрада, з кожным годам помнікаў, якія нагадваюць аб Першай сусветнай вайне, застаецца ўсе менш. Найчасцей на гэта ці не хапае грошай, ці ў мясцовых чыноўнікаў няма ідэй, што рабіць з помнікам пасля яго адбудовы. Аднак, многія з аб'ектаў ваеннай спадчыны маюць высокі турысцкі патэнцыял і могуць садзейнічаць развіццю краязнаўства і рэгіянальнага турызму. На іх аснове магчыма распрацоўка тэматычных турысцкіх маршрутаў, стварэнне як буйных турысцкіх комплексаў з развітай інфраструктурай і шырокім спектрам паслуг, так і невялікіх мемарыялаў і памятных знакаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Брацкія вайсковыя могілкі (Мінск) – Вікіпедыя [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/Брацкія_вайсковыя_могілкі_(Мінск). – Дата доступу: 14.03.2022.

2. Деревня-музей Забродье. Минская область Беларуси – VEDAJ.BY [Электронный ресурс]. Рэжым доступу: –

https://vedaj.by/index.php/ru/mesta/derevnya-muzej-zabrode. – Дата доступу: 14.03.2022.

3. Забродье. О нас [Электронный ресурс]. – Рэжым доступу: https://zabrodje.com/about.php. – Дата доступу: 14.03.2022.

4. Кароза, А.И. Памятники и памятные места Первой мировой войны на территории Беларуси / А.И. Кароза // Первая мировая война на Беларуси: сборник докладов II Международной научно-практической конференции, 15 декабря 2013 г. – Брест : БрГТУ, 2013. – С. 44 – 46.

5. Мемориальный комплекс памяти героев и жертв Первой мировой войны в Сморгони [Электронный ресурс]. – Рэжым доступу: https://www.holiday.by/by/skarb/1196-memorialnyj-kompleks-pamjati-geroev-i-zhertv-pervoj-mirovoj-vojny-v-smorgoni – Дата доступу: 14.03.2022.

6. Минские истории. К 100-летию окончания Первой мировой войны [Электронный ресурс]. – Рэжым доступу: https://minsknews.by/minskie-istorii-k-100-letiyu-okonchaniya-pervoy-mirovoy-voynyi/. – Дата доступу: 14.03.2022.

7. Скаржинский, Е. Памятники и памятные места Первой мировой войны на территории Гродненщины / Е. Скаржинский // Первая мировая война на Беларуси: сборник докладов II Международной научно-практической конференции, 15 декабря 2013 г. - Брест : БрГТУ, 2013. – С. 22 – 26.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Герасимѐнок В.Д., студент 250 группы
дневной формы обучения
Научный руководитель – Лубинская Е.П.,
старший преподаватель

## МУЗЕЙ-БУНКЕР УИНСТОНА ЧЕРЧИЛЛЯ. ИСТОРИЯ И СОВРЕМЕННОСТЬ